Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 259 (328)
ПАНЯДЗЕЛАК
11
ЛІСТАПАДА
1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ДВАЦЦАЦЬ ТРЫ ГОДЫ СОВЕЦКАЙ УЛАДЫ

Даклад тав. М. І. КАЛІНІНА на ўрачыстым пасяджэнні ў Вялікім тэатры 6 лістапада 1940 г.

Таварышы, дваццаць трэці год існавання совецкай улады зойме віднае месца ў гісторыі Саюза ССР. Гэта — год буйных поспехаў як у соцыялістычным будаўніцтве, так і ў галіне знешняй палітыкі.

У пачатку бягучага года выкананне вытворчага плана прамысловасцю сустракала сур'ёзныя цяжкасці. Я маю на ўвазе не звычайныя цяжкасці, абумоўленыя нашым ростам, а цяжкасці, звязаныя з міжнароднай абстаноўкай, якая склалася тады. Гэтыя цяжкасці зразумелы вам без паясненняў.

Тым не менш выкананне плана за 1940 год чакаецца, нават пры асцярожным падліку, з прыростам у 13,6 мільярда рублёў, або на 11 проц. больш у параўнанні з 1939 годам. Сюды, вядома, не ўваходзіць прамысловасць заходніх абласцей Украіны і Беларусі і новых совецкіх рэспублік.

У гэтым годзе мы маем поўныя зрухі ў рабоце металургіі і вугальнай прамысловасці. Рост выплаўкі метала і здабычы каменнага вугалю ідзе няўхільна.

Напрыклад, здабыча каменнага вугалю ў параўнанні з адпаведнымі месяцамі мінулага года склала:

лiпень . . . . 112 проц.
жнівень . . . .114,3 проц.
верасень . . . 116 проц.

Значных поспехаў дабілася каляровая металургія.

Наогул, таварышы, у другой палове бягучага года наглядаецца значны рост нашай цяжкай індустрыі па ўсіх яе разгалінаваннях.

Здавальняюча працавала лёгкая прамысловасць.

З шматлікіх новабудоўляў мне хочацца адзначыць толькі дзве, якія ўжо ўступілі ў пускавы перыяд.

Першая — гэта Угліцкая гідрастанцыя на 110 тысяч кілават. Яна пускаецца скромна, хоць у два разы перавышае Волхаўбуд. Гэтая станцыя з'явіцца сур'ёзным укладам у энергетычную гаспадарку Цэнтральнага раёна, у прыватнасці, — Масквы, і павялічыць глыбокаводнасць Волгі ўніз ад Іванькаўскай плаціны кілометраў на дзвесце.

Другая — гэта Чырчыкская гідрастанцыя ва Узбекістане з магутнасцю першай чаргі ў 43 тысячы кіловат. На базе гэтай станцыі пабудован азотны завод, які будзе здабываць азот з вады і паветра. Тым самым у значнай ступені вырашаецца праблема ўгнаенняў для бавоўняных палёў Сярэдне-азіяцкіх совецкіх рэспублік, а транспарт пазбаўляецца ад адпаведных перавозак.

Наш чыгуначны транспарт справіўся з работай і паспяхова выканаў надзвычайныя заданні.

Нямала дасягненняў мае і сельская гаспадарка, хаця па вегетацыйных умовах 1940 год быў для яе вельмі капрызным.

Зацягнуўшыяся вясной халады загадна патрабавалі правядзення сяўбы ў вельмі скарочаныя тэрміны. Наша калгаснае сялянства здавальняюча справілася з гэтай задачай.

Трэба прама сказаць, што без той тэхнікі, якой насычана соцыялістычная сельская гаспадарка, было-б немагчыма перамагчы капрызы прыроды. І вынік у наяўнасці: у гэтым годзе ў нас атрымаўся добры ўраджай. Валавы збор зерневых блізкі да 7 мільярдаў пудоў.

Поспехі сельскай гаспадаркі нагдядна ілюстрыруюцца сельскагаспадарчай выстаўкай, якая ў гэтым годзе была яшчэ больш масавай, яшчэ шырэй паказала шматлікія галіны калгаснай вытворчасці.

Калі ў мінулым годзе мы мелі 196.743 удзельнікі, то зараз іх колькасць узрасла да 327.566. Сярод іх 348 МТС, 19.730 калгасаў, 951 соўгас, 15.118 калгасных жывёлагадоўчых ферм, 286.994 перадавікі сельскай гаспадаркі.

Замест 45 раёнаў — удзельнікаў выстаўкі 1939 года — Галоўвыстаўкому прышлося зацвердзіць 252.

Яшчэ больш знамянальны той факт, што ўпершыню ўдзельнікамі выстаўкі з'явіліся краі і вобласці ў цэлым, якія перавыканалі ўстаноўленыя паказальнікі за тры годы па зерну, жывёлагадоўлі і датэрмінова выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай. Аб поспехах, дасягнутых у сельскай гаспадарцы асобнымі абласцямі і краямі, гавораць і наступныя даныя.

Удзельнікамі выстаўкі 1940 года з'яўляліся: па Краснадарскаму краю — кожная пятая МТС, у Орджанікідзеўскім краі — адзін з кожных трох калгасаў, Запарожская вобласць прадставіла на выстаўку амаль палавіну сельскагаспадарчых арцелей.

Выстаўку гэтага года ўпрыгожылі справы і дасягненні новых тысяч стаханаўцаў, таленавітых арганізатараў калгаснай вытворчасці. Рэкордныя ўраджаі, прыбаўка ў вазе маладняка і ўдоі, атрыманыя імі, далёка пераўзышлі тыя, якія дэманстрыраваліся ў павільёнах у 1939 годзе.

Наадварот, у Заходняй Еўропе прыродныя капрызы гэтага года, а таксама і вайна, намнога знізілі ўраджай. І там задача — пракарміць насельніцтва з'яўляецца адной з сур'ёзнейшых праблем.

Але неўраджаем паражаны і тыя еўрапейскія краіны, якія не ўдзельнічаюць у вайне.

Для больш быстрых тэмпаў развіцця прамысловасці совецкі ўрад прадпрыняў у гэтым годзе рад асобых мер.

Так, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года ўведзен васьмігадзінны рабочы дзень і сямідзённы тыдзень замест шасцідзёнкі, забаронен самавольны ўход з прадпрыемстваў і ўстаноў і т. д.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 ліпеня 1940 года вызначаны пакаранні за выпуск нядобраякаснай і некамплектнай прадукцыі.

Кожнаму з вас, таварышы, павінна быць зразумела, што ўсе гэтыя Указы праследуюць адну мэту — навесці поўны парадак у вытворчасці, дабіцца яе планамернага росту. Без гэтага не можа развівацца і быстра расці наша прамысловасць. А калі прыняць пад увагу сучасную міжнародную абстаноўку, то тым больш стане відавочнай неабходнасць і мэтазгоднасць гэтых Указаў.

У апошнія дні былі ўзнагароджаны 9 канструктараў, якім прысвоена званне «Герой Социалистического Труда». Гэты факт, таварышы, мае велізарнае значэнне. Ён гаворыць аб высокім развіцці канструктарскай мыслі ў нашай краіне. І вось зараз нам неабходна замацаваць гэтыя дасягненні канструктарскай мыслі якасна добрымі вырабамі.

Да ліку вялікіх мерапрыемстваў совецкага ўрада адносіцца стварэнне дзяржаўных працоўных рэзерваў, чым вырашаецца адна з важнейшых праблем соцыялістычнага будаўніцтва.

У капіталістычных краінах не прыходзіцца задумвацца над стварэннем працоўных рэзерваў. Там пастаянна ёсць велізарная рэзервная армія працы ў асобе масы беспрацоўных. За апошнія два дзесяцігоддзі, у сувязі з зацяжнымі крызісамі, гэтая армія ўзрасла яшчэ больш.

Таму ў капіталістычных краінах прыходзіцца думаць не аб стварэнні працоўных рэзерваў, а аб тым, каб як-небудзь скарыстаць хоць-бы невялікую частку беспрацоўных, даць ім якую-небудзь работу. Армія беспрацоўных — гэта непрыемны, вельмі небяспечны гаручы матэрыял для капіталістычнага свету.

Між іншым у капіталістычных краінах, пры наяўнасці беспрацоўя, у цяперашні час далёка неблагапалучна абстаіць справа з рэзервамі кваліфікаванай рабочай сілы. Напрыклад, у Англіі — класічнай краіне капіталізма — яўна нехапае высокакваліфікаваных рабочых. Гэты залаты фонд капіталісты непрадбачліва растранжырылі ў крызісныя годы.

У Совецкім Саюзе даўно ліквідавана беспрацоўе. Ідзе быстрае развіццё соцыялістычнай прамысловасці. Рэзервы рабочай сілы ў гарадах вычарпаны, а прыток яе з вёскі скараціўся.

Да рэволюцыі разараўшаеся сялянства штогод вылучала мільёны людзей, якія ўходзілі ў горад у пошуках работы. Цяпер калгаснаму сялянству, нават пры мала-мальску добрасумленнай рабоце, забяспечана бязбеднае існаванне. І таму калгасная вёска ўжо не выдзяляе стыхійна рабочую сілу, неабходную для прамысловасці.

Наша прамысловасць і сельская гаспадарка развіваюцца на соцыялістычных планавых пачатках. Дзяржава распараджаецца ў нас усімі матэрыяльнымі фондамі і грашыма,



яна плануе сродкі вытворчасці і фінансы.

Але ў нас яшчэ вельмі недастаткова ажыццяўлялася планіраванне рабочай сілы, якая з'яўляецца адной з галоўных, рашаючых састаўных частак вытворчасці. Калі нават усе элементы вытворчасці ў наяўнасці, а рабочая сіла адсутнічае, то ніякай вытворчасці не атрымаецца, усе элементы вытворчасці без рабочай сілы астануцца мёртвымі.

Недастача кваліфікаваных рабочых, асабліва ў галінах цяжкай індустрыі, тармазіла наша далейшае прасоўванне наперад. Улічваючы гэта, совецкі ўрад прыступіў да стварэння працоўных рэзерваў, да арганізаванай падрыхтоўкі рабочай сілы, нехапаючай соцыялістычнай прамысловасці. Ажыццяўленне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб стварэнні дзяржаўных працоўных рэзерваў, г. зн. падрыхтоўка за кошт дзяржавы ў рамесленых вучылішчах і школах фабрычна-заводскага абучэння кваліфікаваных рабочых, забяспечыць далейшы няўхільны рост нашай прамысловасці.

Характэрна, што ў адной з замежных газет, у якой, як і ва ўсёй буржуазнай прэсе, да ўсіх мерапрыемстваў совецкай улады адносяцца не вельмі зычліва, імкнучыся заўсёды ахаяць усё, што прадпрымаецца совецкай уладаю, — у гэтай газеце пісалі, што пры правядзенні гэтага мерапрыемства ў жыццё Совецкі Саюз у галіне прамысловасці будзе першакласнай краінай. Такія рэчы мы не часта чуем ад нашых ворагаў.

Абавязак нашых партыйных, профсаюзных, комсамольскіх і гаспадарчых арганізацый усімі спосабамі дапамагаць стварэнню дзяржаўных працоўных рэзерваў.

Таварышы, я ўжо гаварыў вам, што знешнія падзеі за гэты год мелі ўплыў і на нашу эканоміку. Ды і як жа ім было не ўплываць! Даволі ўспомніць, што з 1 снежня мінулага года пачалася вайна з Фінляндыяй, якая патрабавала ад нас вядомых намаганняў.

Вы ведаеце, што сілы прыроды тут былі цалкам супроць совецкіх войск. Непраходныя лясы, балоты, глыбокія снягі, марозы, якія на працягу амаль усёй кампаніі трымаліся на ўзроўні 40 градусаў, перашкаджалі поўнаму ўжыванню нашай ваеннай тэхнікі.

Але совецкія войскі паказалі, што па сутнасці для іх няма перашкод. Праз тры месяцы Фінляндыя павінна была падпісаць мір на ўмовах, прапанаваных Совецкім Саюзам.

Гэтая вайна яшчэ не знайшла свайго летапісца. І наогул у нас вельмі мала напісана аб выдатнейшых, выключна гераічных подзвігах нашых часцей і асобных людзей у перыяд фінскай кампаніі.

Прадажная буржуазная прэса паклёпнічала на Чырвоную Армію. Аднак, нарэшце, цэлы рад карэспандэнтаў павінен быў распісацца і засведчыць у той-жа буржуазнай прэсе, што яны давалі хлуслівыя карэспандэнцыі, каб апарочыць Чырвоную Армію.

Я думаю, наша ваеннае ведамства пастараецца адлнавіць у друку сапраўдны малюнак гэтай вайны.

За фінскую кампанію ўзнагароджаны ордэнамі, медалямі і іншымі знакамі адрознення многія воінскія часці, дзесяткі тысяч байцоў, камандзіраў, палітработнікаў і іншых яе ўдзельнікаў. Вядома, дастойных узнагароды было няьмерна больш. Аб гэтым сведчылі самі ўзнагароджаныя пры атрыманні ордэнаў. 405 чалавекам прысвоена званне «Герой Совецкага Саюза». А гэта ў нас — вышэйшая ўзнагарода, якая даецца за выключныя подзвігі.

Ужо адны гэтыя лічбы гавораць аб доблесці і геройстве нашай Чырвонай Арміі. Значыць, тая любоў, якой карыстаецца ў нас Чырвоная Армія літаральна сярод усяго насельніцтва, як бачыце, поўнасцю апраўдана перад народам.

Таварышы, у гэтым годзе значна ўзрасла тэрыторыя і колькасць насельніцтва Совецкага Саюза за лік далучыўшыхся да нас трох рэспублік: Эстоніі, Латвіі і Літвы.

Гэтае далучэнне вельмі характэрна. Я асабіста не ведаю ў гісторыі падобных прыкладаў.

20 год панавалі капіталістычныя клікі ў Эстоніі, Латвіі і Літве. 20 год яны вялі агітацыю, імкнучыся прывіць сваім народам нянавісць да Совецкага Саюза. І ўсё-ж яны не змаглі заглушыць глыбокага пачуцця сімпатыі гэтых народаў да Совецкага Саюза.

Ранейшыя ўрады Эстоніі, Латвіі і Літвы, якія фактычна не мелі апоры ў народзе, павінны былі ўступіць месца народным урадам. А гэтыя ўрады, выконваючы волю сваіх народаў, звярнуліся да совецкага ўрада з просьбай аб далучэнні да СССР. Канечны рэзультат такі: сёння Эстонія, Латвія і Літва з'яўляюцца поўнапраўнымі рэспублікамі вялікага Совецкага Саюза.

Вось вам канкрэтнае праяўленне глыбокага пачуцця сімпатыі народаў гэтых краін да СССР.

У гэтым-жа годзе была выпраўлена вялікая гістарычная несправядлівасць — з'еднана Бесарабія з Совецкім Саюзам.

Трэба ўспомніць усю вераломнасць румынскіх баяр і капіталістаў. У мінулую сусветную вайну Расія была саюзнікам Румыніі. Рускія войскі біліся на румынскім фронце, абараняючы румын ад германскіх войск. А вось калі ў нас да ўлады прышлі рабочыя і сяляне, румынскія баяры і капіталісты, скарыстаўшы нашу часовую слабасць, захапілі частку нашай тэрыторыі.

Цяпер мы вярнулі Бесарабію і Паўночную Букавіну, населеную ўкраінцамі. Залішне гаварыць, з якім захапленнем бесарабцы і ўкраінцы Паўночнай Букавіны далучыліся да Совецкага Саюза. Гэта вельмі добра адчулі на сабе часці нашай Чырвонай Арміі, якія з захапленнем сустракаліся насельніцтвам гэтых тэрыторый.

Ітак, таварышы, каля 23 мільёнаў насельніцтва далучылася за гэты год да Совецкага Саюза. Яны толькі што далучыліся, але здаецца, што гэта як-быццам старыя совецкія тэрыторыі. Яны атрымалі ўсе правы совецкага грамадзянства, пачынаючы ад пачотнага права служыць у Чырвонай Арміі. А арміі Эстоніі, Латвіі і Літвы цалкам уліліся ў састаў Чырвонай Арміі. І ўжо адзін гэты факт паказвае, наколькі вялікае, наколькі моцнае сапраўднае брацтва народаў Совецкага Саюза. Знайдзіце ў гісторыі хоць адзін аналагічны прыклад!

Таварышы, зараз ідзе вайна паміж вялікімі, кіруючымі еўрапейскімі дзяржавамі і ўжо чацверты год прадаўжаецца вайна на Далёкім Усходзе. Значыць, у стане вайны знаходзіцца амаль увесь свет. З вялікіх дзяржаў фактычна толькі адзін Совецкі Саюз знаходзіцца паза вайной, захоўваючы строгі нейтралітэт.

Вядома, такая велізарная вайна не можа не закранаць нейтральныя краіны, ну, хоць-бы тым, што знешні гандаль, па крайняй меры марскі, значна тармозіцца. Але ўсётакі, калі амаль увесь свет ахоплен такой вайной, быць па-за ёю — гэта вялікае шчасце.

Я павінен сказаць, што такое становішча не ствараецца само сабой. Яно ёсць вынік нашых унутраных дасягненняў і поспехаў нашай знешняй палітыкі. Яно ёсць вынік дзейнасці нашага кіраўніцтва.

А кіраўніцтва гаспадарчае, знешне-палітычнае, ваеннае зыходзіць ад таварыша Сталіна **(бурныя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю).** Такім чынам, усё гэта вынік, справа сталінскага кіраўніцтва.

Таварышы, склаўшаяся міжнародная абстаноўка не дае нам права быць абыякавымі наглядальнікамі, спакойнымі сузіральнікамі развіваючыхся падзей. Гэтая абстаноўка накладае на кожнага совецкага грамадзяніна адказныя абавязкі.

Совецкі Саюз — адзіная ў свеце соцыялістычная дзяржава. Упершыню за ўсю гісторыю працоўныя маюць сваю сапраўдную радзіму.

Соцыялістычная радзіма — якое гэта вялікае слова! І няма больш узвышанай, больш благароднай і святой задачы, чым задача служыць сваёй соцыялістычнай айчыне, служыць не словамі, а справамі.

Першы і самы галоўны наш абавязак — гэта далейшае ўмацаванне гаспадарчай і абароннай магутнасці соцыялістычнай радзімы.

Рабочы, калгаснік, служачы, інжынер, артыст, пісьменнік, вучоны — кожны совецкі чалавек у сваёй галіне павінен укласці ўсю сваю энергію і волю, усе свае здольнасці і сілы для таго, каб забяспечыць яшчэ большае працвітанне, каб узняць яшчэ вышэй магутнасць нашай соцыялістычнай радзімы.

Гэта і будзе выкананнем народамі нашага Саюза свайго абавязку перад міжнародным пролетарыятам. Гэта і будзе сапраўднай барацьбой за комунізм.

У гэтай барацьбе за комунізм намі кіруе комуністычная партыя, таварыш Сталін. І сёння, у дзень свята совецкай улады, у дзень 23-годдзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, падводзячы вынікі нашай барацьбы, мы з глыбокім пачуццём, з адкрытым сэрцам вітаем нашага правадыра — вялікага Сталіна. **(Бурная авацыя).**

Няхай жыве XXIII гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі! **(Апладысменты).**

Няхай жыве вялікі совецкі народ! **(Апладысменты).**

Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная партыя (большэвікоў)! **(Апладысменты).**

Няхай жыве правадыр совецкага народа — вялікі **Сталін! (Бурная, працяглая авацыя. Усе ўстаюць. Аркестр выконвае «Інтэрнацыянал». У зале раздаюцца прывітальныя воклічы ў чэсць таварыша Сталіна).**

Звыш 5 тысяч баявых самалётаў удзельнічала ў паветраных парадах па СССР 7 лістапада 1940 года

Авіяцыйныя парады адбыліся ў гарадах: Масква, Рыга, Львоў, Орол, Талін, Чэрнаўцы, Воронеж, Кіеў, Одэса, Архангельск, Мурманск, Севастопаль, Тбілісі, Новасібірск, Іркуцк, Ерэван, Выбарг, Краснаярск, Чыта, Ашхабад, Батумі, Сталінабад, Баку, Алма-Ата, Уладзівасток, Растоў-на-Дану, Ташкент, і іншых прыграпічных гарадах.

Звыш 5 тысяч баявых самалётаў розных тыпаў (бамбардыроўшчыкі, знішчальнікі, штурмавікі і іншыя) чоткім строем прайшлі над плошчамі святочных гарадоў. Машыны пілатыравалі з выключнейшай дакладнасцю і лётным майстэрствам. Усеагульнае захапленне працоўных выклікалі самалёты новых канструкцый. У паветраных парадах удзельнічалі таксама скорасныя бамбардыроўшчыкі, маючыя вялікую манеўранасць, высотнасць, грузапад'ёмнасць. Знішчальнікі праносіліся на значных хуткасцях.

Совецкі народ горача вітаў слаўных лётчыкаў сталінскай авіяцыі, канструктараў, — Герояў Соцыялістычнай Працы і рабочых авіяцыйных заводаў, якія даюць Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскому Флоту выдатнейшую паветраную тэхніку.

Дрэннае надвор'е перашкодзіла правядзенню паветраных парадаў у радзе гарадоў Совецкага Саюза. З-за дрэнных метэаралагічных умоў (снегапад і дождж) не адбыліся авіяцыйныя парады ў Ленінградзе, Хабараўску, Петразаводску, Харкаве, Мінску, Вільнюсе, Бірабіджане, Каўнасе, Благавешчэнску, Гродне, Беластоку і іншых гарадах.

У радзе гарадоў (напрыклад, у Кіеве, Выбаргу і іншых) па гэтай-жа прычыне паветраныя парады былі праведзены ў скарочаным аб'ёме.

Як мяркуюць, у выпадку спрыяльнага надвор'я ў гэтых гарадах агульная колькасць баявых самалётаў, удзельнічаўшых на парадах, склала-б звыш 8 тысяч адзінак.

«0»

КАМЮНІКЕ АБ ПАЕЗДЦЫ СТАРШЫНІ СОЎНАРКОМА СССР І НАРОДНАГА КАМІСАРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ В. М. МОЛАТАВА Ў БЕРЛІН

Па запрашэнню Германскага Ўрада і ў адказ на мінулагоднія паездкі Германскага Міністра Замежных Спраў фон-Рыбентропа ў Маскву Старшыня Совета Народных Камісараў СССР і Народны Камісар Замежных Спраў Молатаў у бліжэйшы час наведае Берлін, каб у рамках дружалюбных адносін, існуючых паміж абодвума краінамі, шляхам аднаўлення асабістага кантакта прадоўжыць і паглыбіць бягучы абмен думкамі.

АД'ЕЗД СТАРШЫНІ СОЎНАРКОМА СССР І НАРОДНАГА КАМІСАРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ тав. В. М. МОЛАТАВА Ў БЕРЛІН

10 лістапада г. г. у 18 гадзін 45 мінут выехаў з Масквы ў Берлін Старшыня Соўнаркома СССР і Народны Камісар Замежных Спраў тав. В. М. Молатаў у суправаджэнні Народнага Камісара Чорнай Металургіі тав. Тэвасяна І. Т., Намесніка Народнага Камісара замежных спраў тав. Дэканозава В. Г., намесніка Народнага камісара Знешняга гандлю т. Крутікава А. Д. і іншых.

На Беларускім вакзале тав. Молатава праводзілі: Намеснікі старшыні СНК СССР тт. Мікаян А. І., Варашылаў К. Е., Кагановіч Л. М., Булганін Н. А., Народныя Камісары і інш., а таксама члены дыпламатычнага корпуса і ўвесь састаў Германскага пасольства ў Маскве.

Вакзал быў упрыгожан сцягамі. Для праводаў тав. В. М. Молатава быў выстаўлен пачотны караул.

Адначасова выехалі ў Берлін Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Германіі граф фон дэр Шуленбург, пан Шнурэ і інш.

Парад несакрушымай магутнасці совецкага народа

На Краснай плошчы ў дзень XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

У паветранным парадзе ў Маскве прымала ўдзел да 700 самалётаў.

Народы Совецкага Саюза ўрачыста святкавалі XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Масква яшчэ напярэдадні апранулася ў маляўнічае святочнае ўбранне, любоўна створанае лоўкімі рукамі мастакоў.

Дзень на рэдкасць пагодлівы. Сонца шчодра залівае Маскву патокамі сваіх праменняў. Радыёрупар і аркестры разносяць гукі святочнай музыкі. Гучаць песні — баявыя і вясёлыя, песні, з якімі лёгка спорыцца работа і радасны адпачынак.

Красная плошча. Яна выглядае велічна і ўрачыста. На франтоне будынка супроць маўзалея—партрэты Леніна і Сталіна пад ценем сцягоў. На рускай, нямецкай, французскай, англійскай, іспанскай і кітайскай мовах начэртаны бяссмертныя словы Комуністычнага Маніфеста: «Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!».

К 10 гадзінам запаўняюцца трыбуны ля Крэмлёўскай сцяны. Тут сабраліся члены ЦК ВКП(б), дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і РСФСР, Героі Совецкага Саюза, Героі Соцыялістычнай Працы, знатныя стаханаўцы і ўдарнікі маскоўскіх прадпрыемстваў, славутыя дзеячы навукі, тэхнікі, літаратуры і мастацтва, камандзіры і палітработнікі Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. У кругу масквічоў на свяце ўпершыню прысутнічаюць дэлегацыі працоўных Літвы, Латвіі, Эстоніі, Бесарабіі і Паўночнай Букавіны, пасланцы вызваленых народаў, якія нядаўна ўступілі ў сям'ю магутнага Совецкага Саюза. Тут-жа знаходзяцца прадстаўнікі арміі прыязнай Мангольскай Народнай Рэспублікі. Некалькі трыбун займаюць чыны дыпламатычнага корпуса, карэспандэнты совецкай і замежнай прэсы.

На плошчы і прылягаючых вуліцах бездакорнымі прамавугольнікамі пастроены вайсковыя часці, якія прадстаўляюць на святочным парадзе ўсе роды войск.

Камандуючы войскамі Маскоўскай Ваеннай Акругі генерал арміі І. В. Тюленеў аб'язджае войскі.

11 гадзін. На трыбуну маўзалея ўзнімаюцца таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, Л. М. Кагановіч, М. І. Калінін, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, Л. П. Берыя, Н. М. Шверпік, Г. М. Маленкоў, Г. М. Дзімітраў, М. Ф. Шкіратаў, Л. З. Мехліс, А. С. Шчэрбакоў, Н. А. Булганін, А. Я. Вышынскі, А. Н. Паскробышаў, А. Е. Бадаеў, С. А. Лазоўскі, А. Ф. Горкін і іншыя члены ЦК ВКП(б), Урада і Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР. Грыміць захапляная авацыя ў чэсць вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна і яго саратнікаў. На ніжняй трыбуне маўзалея — адмірал Н. Г. Кузнецоў, маршалы Совецкага Саюза С. М. Будзённы, Г. І. Кулік, Б. М. Шапашнікаў, генерал арміі К. А. Мерэцкоў, генералітэт Чырвонай Арміі.

З Спаскіх варот Крэмля выязджае Народны Камісар Абароны Герой Совецкага Саюза маршал Совецкага Саюза С. К. Тімашэнка. Трыбуны рукаплешчуць.

Прыняўшы рапарт камандуючага парадам генерала арміі Тюленева, маршал аб'язджае войскі і вітаецца з імі. У адказ на прывітанне наркома грыміць магутнае чырвонаармейскае і чырвонафлоцкае «ура».

Аб'езд войск закончан. Таварыш С. К. Тімашэнка ўзнімаецца на трыбуну маўзалея і гаворыць кароткую прамову. Па даручэнню Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў) і Урада Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік ён віншуе чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў, рабочых, калгаснікаў, навуковых работнікаў, прадстаўнікоў працоўнай інтэлігенцыі, делегацыі працоўных Латвіі, Эстоніі, Літвы, Бесарабіі, Паўночнай Букавіны з XXIII гадавінай Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі.

З вялікай увагай слухае ўся Масква выключна яркую прамову таварыша Тімашэнка. Кожнае слова гэтай прамовы важкае і значнае. Яно падмацавана гістарычнымі перамогамі, атрыманымі пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў, пад геніяльным вадзіцельствам Сталіна, выражае спакойную ўпэўненасць вялікага совецкага народа, які няўтомна умацоўвае магутнасць сваёй любімай соцыялістычнай Радзімы.

Калі тав. Тімашэнка, канчаючы прамову, абвяшчае здравіцу ў чэсць таварыша Сталіна, раздаецца грамавое «ура». Аркестр выконвае «Інтэрнацыянал», грымяць раскаты святочнага артылерыйскага салюта.

11 гадзін 30 мінут. Пачынаецца ўрачысты марш часцей. Гэта была незабыўная дэманстрацыя магутнасці ўзброеных сіл совецкага народа. Марш адкрываюць слухачы Чырвонасцяжнай і ордэна Леніна Ваеннай Акадэміі імені М. В. Фрунзе. Калону ўзначальвае начальнік Акадэміі тройчы ордэнаносец генерал-лейтэнант Хозін. Сцяг Акадэміі нясе Герой Совецкага Саюза Карсанаў у суправаджэнні асістэнтаў — Герояў Совецкага Саюза Армана і Машляка. У радах ідуць Героі Совецкага Саюза.

Затым ідуць калоны Ваенна-Палітычнай ордэна Леніна Акадэміі імені В. І. Леніна, артылерыйскай ордэна Леніна Акадэміі імені Ф. Э. Дзяржынскага, Ваеннай Акадэміі матарызацыі і механізацыі імені І. В. Сталіна, ваеннай Акадэміі хімічнай абароны імені К. Е. Варашылава, ваенна-інжынернай Акадэміі імені В. В. Куйбышава, ваенна-паветранай Акадэміі імені Н. Е. Жукоўскага і іншых навучальных устаноў Чырвонай Арміі.

Ідзе полк грамадзянскай авіяцыі, узначальваемы начальнікам Акадэміі грамадзянскага паветранага флота Героем Совецкага Саюза камбрыгам М. Т. Слепнёвым. У саставе гэтага палка нямала жанчын. Лётчыкі, якія зведалі шматлікія паветраныя трасы, таксама ўпэўнена трымаюцца ў сухаземным страі, як і ў прывычнай для іх паветранай стыхіі. Выдатныя пілоты, налётаўшыя не адну тысячу кілометраў, яны гатовы ў любую мінуту сесці за штурвалы баявых самалётаў.

Усеагульнае захапленне выклікае самкнуты строй зводнага батальёна маракоў, прыбыўшых з караблёў Балтыкі, Чорнага мора, Ціхага акіяна. Горда развяваецца баявы сцяг Чырвонасцяжнага Балтыйскага Флота.

Бездакорна трымаючы раўненне, ідзе пяхота. Грамавым «ура» вітаюць пехацінцы таварыша Сталіна. Пехацінцы праходзяць з вінтоўкамі наперавес. Усеагульную ўвагу прыцягвае новае дасканалае ўзбраенне пяхоты. Значная частка байцоў узброена вінтоўкамі з аптычнымі прыцэламі, лёгкімі вінтоўкамі-аўтаматамі, ручнымі кулямётамі, гранатамётамі. Над стварэннем навейшых тыпаў стралковага ўзбраення няўтомна працуе дапытлівая думка самых таленавітых совецкіх канструктараў, такіх, як тт. Дзегцяроў і Токараў, чые заслугі ў гэтай галіне адзначаны высокім званнем Героя Соцыялістычнай Працы.

Разам з часцямі Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота ў парадзе ўдзельнічае ўзброены атрад працоўных сталіцы.

На рысях праходзяць кавалерыйскія часці. Ідзе конная артылерыя, якая атрымала ў апошні час новае ўзбраенне. Бясшумна перасякаюць плошчу веласіпедысты—члены добраахвотных спартыўных таварыстваў Масквы. Затым пачынаецца марш мота-механізіраваных часцей. Быстра праносяцца матацыклісты-кулямётчыкі, праязджаюць бронемашыны розных тыпаў. На грузавіках едзе матарызаваная пяхота, здольная ў найкарацейшыя тэрміны праробляць многакіламетравыя маршы, мабільная і грозная. Сонечныя праменні гуляюць у велізарных пражэктарах. За імі зенітныя кулямёты, зенітныя гарматы малога і сярэдняга калібра, зенітная артылерыя буйнага калібра. Ствалы гармат накіраваны ў неба, як грознае папярэджанне. Варожы самалёт ніколі не зможа беспакарана паявіцца пад совецкім небам.

На плошчу ўступае артылерыя на механічнай цязе. Тыпы і калібры гармат разнастайныя. Тут і дальнабойныя гарматы, і магутныя гаубіцы на гусенічным ходу. Найскладанейшая артылерыйская тэхніка выклікае захапленне на трыбунах. Грознае шэсце замыкаюць магутныя гарматы далёкага дзеяння—пушкі і гаубіцы. На трыбунах раздаюцца бурныя воплескі. Совецкі народ выказвае сваё гарачае адабрэнне плённай рабоце слаўнай плеяды канструктараў-артылерыстаў—Герояў Соцыялістычнай Працы В. Г. Грабіна, І. І. Іванова, М. Я. Крупчатнікава, іх памочнікаў і вучняў.

Па плошчы з велізарнай хуткасцю праносяцца тры скорасных танкі. За імі праходзяць цяжкія танкі. На бронемашынах імёны—«Сталін», «Клім Варашылаў», «Кіраў», «Жданаў».

Урачысты марш наземных часцей Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, які працягваўся каля паўтары гадзін, заканчваецца. Праходзіць зводны аркестр. У гэты час у блакітным бязвоблачным небе паяўляюцца срабрыстыя двухматорныя бамбардыроўшчыкі. Яны ляцяць нізка, праводзімыя захопленымі поглядамі. На іх пласкасцях выразна бачны чырвоныя зоркі. Буйнымі злучэннямі пралятаюць знішчальнікі. У паветраным парадзе прымаюць удзел розныя тыпы самалётаў бамбардыровачнай, знішчальнай і штурмавой авіяцыі. Усеагульнае захапленне выклікаюць самалёты новых канструкцый. Паяўляюцца магутныя пасажырскія самалёты. Усё гэта машыны навейшых канструкцый, маючыя вялікую хуткасць і значны радыус дзеяння. Баявыя самалёты аснашчоны першакласнымі сродкамі паветранага бою, здольнымі разграміць любыя сілы праціўніка. Погляды мільёнаў масквічоў не адрываюцца ні на мінуту ад нябеснага своду. І кожны з гордасцю гаворыць імёны стваральнікаў выдатных паветраных караблёў і авіяцыйнага ўзбраення—Герояў Соцыялістычнай Працы Палікарпава, Якаўлева, Шпітальнага, Мікуліна, Клімава, памнажаючых магутнасць нашай радзімы ў паветры. Высокім лётным майстэрствам валодаюць у дасканаласці гордыя сталінскія сокалы, бясстрашныя пілоты, якія сядзяць за штурваламі баявых самалётаў. Звенні, эскадрыллі, паветраныя палкі праходзяць бездакорным строем. Лётчыкі трымаюць раўненне ў паветры таксама ўпэўнена і закладна, як і наземныя часці Чырвонай Арміі. У паветраным парадзе, які выклікаў захапленне наглядальнікаў, удзельнічала да 700 самалётаў.

Святочны парад на Краснай плошчы яшчэ і яшчэ раз паказаў ваенна-тэхнічную магутнасць узброеных сіл совецкага народа, ён з'явіўся аглядам выдатных людзей Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, валодаючых грознай ваеннай тэхнікай. Байцы, камандзіры і палітработнікі прадэманстрыравалі ў гэты дзень сваю бязмежную любоў і адданасць партыі большэвікоў, ураду, вялікаму правадыру народаў таварышу Сталіну, сваю гатоўнасць нанесці сакрушальны ўдар любому ворагу, адкуль-бы ён ні паявіўся.

(ТАСС).

Прамова Народнага Камісара Абароны Маршала Совецкага Саюза тав. ТІМАШЭНКА С. К.

Таварышы чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі, рабочыя, калгаснікі і работнікі інтэлігентнай працы, таварышы прадстаўнікі Совецкай Літвы, Латвіі, Эстоніі, Бесарабіі і Паўночнай Букавіны!

Па даручэнню Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай Партыі большэвікоў, Урада Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, віншую вас з XXIII гадавінай Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі!

Таварышы!

Прайшоў яшчэ адзін год вялікай пленнай работы народаў Совецкага Саюза.

Мінуўшы год увойдзе ў гісторыю Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі — як год новых сусветна-гістарычных перамог соцыялізма, атрыманых нашай краінай пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, пад мудрым вадзіцельствам вялікага СТАЛІНА.

Совецкі народ, з пачуццём глыбокай веры ў свае сілы, паспяхова праводзіць у жыццё велічны план Трэцяй сталінскай пяцігодкі.

Ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі мы адзначаем выдатныя поспехі і дасягненні.

Растуць, крэпнуць і бесперапынна рушацца ўперад наша соцыялістычная прамысловасць і соцыялістычнае земляробства. Усё больш павялічваецца вытворчасць прадметаў узбраення, машын, нафты, металу, вугалю, тавараў шырокага спажывання і сельскагаспадарчых прадуктаў.

Няўхільна павышаецца прадукцыйнасць працы, паўсюды ўмацоўваецца працоўная дысцыпліна. На прадпрыемствах і ва ўстановах, соўгасах і калгасах наводзіцца сапраўдны большэвіцкі парадак.

Усё больш шырыцца стаханаўскі рух. Растуць рады перадавых людзей нашай краіны — ініцыятараў высокай прадукцыйнасці працы.

Наша краіна стала ў многа разоў мацней і больш магутнай у абаронных і гаспадарчых адносінах.

Таварышы!

Дваццаць трэцюю гадавіну Кастрычніка мы адзначаем у выключна складанай міжнароднай абстаноўцы.

Вайна прымае ўсё больш шырокія размеры, захватваючы ў сваю арбіту новыя краіны, новыя дзяржавы і народы.

Ужо больш палавіны насельніцтва зямнога шара ўцягнута ў гэтую бойню.

Законы вайны суровыя і няўмольныя. Вайна сцеле смерць і разбурэнні. Гінуць сотні тысяч людзей. Знішчаюцца найвялікшыя помнікі культуры і незлічоныя матэрыяльныя каштоўнасці, створаныя працай рабочых і сялян.

Мудрая сталінская знешняя палітыка — палітыка міру паміж народамі і забеспячэння безапаснасці нашай радзімы — прывяла да новых выдатных перамог. Совецкі Саюз не ўдзельнічае ў вайне. Совецкі Урад забяспечыў мірную працу народам нашай краіны.

Непамерна ўзрасла роля Совецкага Саюза ў вырашэнні міжнародных пытанняў. Павысіўся яго аўтарытэт у вачах працоўных усяго свету. Апіраючыся на сілу і магутнасць Чырвонай Арміі, Совецкі Урад, мірным шляхам, вырашыў совецка-румынскі канфлікт па пытанню аб Бесарабіі і Паўночнай Букавіне.

Народы Бесарабіі і Паўночнай Букавіны вырваны з палону і вызвалены ад іга румынскіх баяр. Назаўсёды асталіся ззаду іх 22-гадовыя пакуты.

У Літве, Латвіі і Эстоніі знішчана ненавісная для працоўных мас улада памешчыкаў і капіталістаў. З гэтага часу гаспадарамі свайго жыцця сталі самі рабочыя, сяляне, працоўная інтэлігенцыя гэтых краін.

Вызваленыя народы Літвы, Латвіі, Эстоніі, Бесарабіі і Паўночнай Букавіны раз і назаўсёды пазбаўлены ад галечы, голаду, эксплаатацыі, разбурэння і бяспраўя. Перад імі раскрыліся найшырэйшыя перспектывы новага, шчаслівага і заможнага жыцця. Над імі ўзышло сонца Сталінскай Канстытуцыі, пад яркімі праменнямі якога ўсё больш і больш будуць расцвітаць прамысловасць, сельская гаспадарка, навука, культура і мастацтва гэтых народаў.

Абараняючы безапаснасць сваіх рубяжоў і забяспечваючы свае дзяржаўныя інтарэсы, Совецкі Саюз значна вырас і прасунуў свае граніцы на ўзбярэжжа Фінскага заліва, Балтыйскага мора і Дуная.

Капіталістычнаму свету прышлося пацясніцца і ўступіць.

Усё гэта мае выключнае значэнне для ўмацавання абараназдольнасці нашай краіны.

Але як-бы ні вялікія былі нашы дасягненні — нам не да твару зазнавацца і супакойвацца на дасягнутым.

У напружанай міжнароднай абстаноўцы, якая поўна рознымі нечаканасцямі, мы павінны праявіць максімальную пільнасць і заўсёды памятаць указанні таварыша Сталіна аб тым, што «трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку»...

Усё гэта абавязвае нас яшчэ больш працаваць над узмацненнем гаспадарчай і абароннай магутнасці нашай краіны, над усямерным умацаваннем Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Працоўныя нашай краіны павінны працаваць на дабро сваёй радзімы яшчэ больш і лепш, павінны насаджаць працоўную дысцыпліну на нашых заводах, усямерна павышаць прадукцыйнасць працы і паляпшаць якасць выраблясмай прадукцыі, павінны сваімі чэснымі і добрасумленнымі адносінамі да працы множыць багацці Совецкага Саюза і ўзмацняць тым самым магутнасць нашай радзімы і нашай Чырвонай Арміі.

Таварышы!

Наша родная Чырвоная Армія з'яўляючыся магутным аплотам мірнай працы народаў Совецкага Саюза, верным вартавым заваёў Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, няўхільна ўмацоўвае сваю магутнасць.

Чырвоная Армія заўсёды гатова выканаць свой свяшчэнны доўг і апраўдаць любоў і давер'е вялікага совецкага народа.

Запэўніваю Урад Совецкага Саюза і Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі большэвікоў, што Чырвоная Армія ў любы момант, па першаму кліча партыі і ўрада, гатова даць знішчальны адпор усім, хто асмеліцца пасягнуць на свяшчэнныя граніцы нашай соцыялістычнай дзяржавы.

Няхай жыве дваццаць трэцяя гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі!

Няхай жыве вялікая сям'я народаў Совецкага Саюза!

Няхай жывуць вызваленыя народы Літвы, Латвіі, Эстоніі, Бесарабіі і Паўночнай Букавіны!

Няхай жыве наша слаўная Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот!

Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная Партыя большэвікоў — перадавы атрад працоўных Совецкага Саюза!

Няхай жыве наш родны, любімы СТАЛІН!

Дэманстрацыя працоўных на Краснай плошчы

7 лістапада 1940 года праз Красную плошчу прайшло 1.600 тысяч дэманстрантаў. Тры гадзіны 40 мінут працягвалася гэта велічнае шэсце — дэманстрацыя згуртаванасці, сілы і маральна-палітычнага адзінства совецкага народа.

Першыя 12 раёнаў уступілі на плошчу, калі палкі скорасных знішчальнікаў паявіліся над Гістарычным музеем. Імклівы і грозны быў іх палёт. Лётчыкі сталінскай авіяцыі вялі дзесяткі баявых самалётаў, створаных, як і ўвесь магутны арсенал узброеных сіл СССР, творчасцю нашых канструктараў, рабочых, інжынераў.

Дэманстранты на Краснай плошчы рапартавалі партыі і ўраду аб сваіх перамогах у гаспадарчым і культурным будаўніцтве, аб датэрміновым выкананні вытворчых планаў, умацаванні соцыялістычнай дысцыпліны, росце прадукцыйнасці працы.

— Няхай жыве Радзіма! Няхай жыве Сталін! — праўзгалашаюць працоўныя перадавога металургічнага гіганта—завода «Серп і молат».

Гэты вокліч падхапляюць тысячы лікуючых людзей: совецкія людзі ведаюць, што ўсімі сваімі поспехамі яны абавязаны мудраму сталінскаму кіраўніцтву. Магутнае «ура», не змаўкаючы, грыміць над плошчаю. Таварышы Сталін, Молатаў, кіраўнікі партыі і ўрада вітаюць шчаслівы совецкі народ.

Праз плошчу ідуць калектывы буйнейшых прадпрыемстваў сталі-

заводаў «Красный пролетарий», «Калібр», «Каучук»... Усе яны рапартуюць аб поспехах, дасягнутых у перадкастрычніцкім соцыялістычным спаборніцтве, аб сотнях станкоў, прыбораў, машын, аб сотнях тысяч метраў тканін, выпушчаных звыш плана.

— Няхай жыве наш рабочы клас! Стаханаўцам заводаў і фабрык большэвіцкае прывітанне! — праўзгалашаюць з цэнтральнай трыбуны, і ў адказ грыміць магутнае «ура».

У лозунгах дэманстрантаў ярка адлюстраваны клопаты працоўных аб соцыялістычнай арганізаванасці, узорным парадку і дысцыпліне на прадпрыемствах.

«Барацьба з прагульшчыкамі і дэзарганізатарамі вытворчасці ёсць барацьба за ўмацаванне магутнасці нашай радзімы і яе Чырвонай Арміі. Няхай жывуць працоўная дысцыпліна і ўзорны парадак на прадпрыемствах нашай радзімы!»

Гэты лозунг Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), які выражае волю і думкі ўсіх совецкіх патрыётаў, многа разоў паўтараецца ў святочнай дэманстрацыі. Працоўныя сталіцы, праходзячы міма трыбун, запэўніваюць кіраўнікоў партыі і ўрада, што гэта важнейшая дзяржаўная задача будзе выканана па-большэвіцку.

Перад маўзалеем праходзяць дэлегацыі калгаснікаў ордэнаноснай Маскоўскай вобласці — майстраў стаханаўскіх ураджаяў. Яны прыехалі ў госці да працоўных сталіцы і зараз разам з імі святкуюць вялікую гадавіну.

...совецкай інтэлігенцыі.

Некалькі гадзін назад адсюль, з Краснай плошчы, дзесяткі мільёнаў людзей чулі прамову Народнага Камісара Абароны СССР маршала Совецкага Саюза тав. С. К. Тімашэнка. Ён яшчэ раз напомніў словы таварыша Сталіна аб тым, што трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку.

Высока над радамі дэманстрантаў падняты тысячы партрэтаў Леніна і Сталіна, плакатаў і лозунгаў з начэртанымі на іх словамі прывітання кіраўнікам партыі і ўрада. Старыя, дарослыя, юнакі праходзяць па плошчы, не адрываючы поглядаў ад трыбуны маўзалея, дзе, акружаны сваімі баявымі саратнікамі, стаіць вялікі і мудры правадыр совецкага народа, арганізатар і натхніцель усіх перамог соцыялістычнага будаўніцтва.. Бясконцай любоўю да таварыша Сталіна, глыбокай удзячнасцю яму за шчаслівае жыццё прасякнуты кожны вокліч, кожны лозунг дэманстрантаў.

— Няхай жыве таварыш Сталін!

— Прывітанне вялікаму Сталіну!

— Роднаму Сталіну — ура!

Гэтыя воклічы, ні на мінуту не змаўкаючы, раздаюцца з канца ў канец плошчы. Працоўныя сталіцы горача вітаюць главу совецкага ўрада таварыша Молатава, таварышоў

...мітрава, Тімашэнка, Маленкова.

Сённяшняе Кастрычніцкае свята асабліва радаснае і знамянальнае. У брацкую сям'ю совецкіх народаў уліліся працоўныя Бесарабіі, Паўночнай Букавіны, Літвы, Латвіі і Эстоніі, якія назаўсёды скінулі ярмо капіталістычнага рабства і сталі пад непераможны чырвоны сцяг соцыялізма. У гэту гадзіну, калі па Краснай плошчы ішлі лікуючыя калоны працоўных — разам з імі святкавалі сталіцы новых совецкіх рэспублік — Кішынёў, Каўнас, Рыга, Талін, дзесяткі і сотні гарадоў і вёсак, дзе яшчэ паўгода назад уладарылі памешчык і капіталіст. Вызваленыя народы чулі Красную плошчу, голас роднай Масквы.

Працоўныя чырвонай сталіцы начэрталі на сваіх святочных сцягах словы, што выражаюць думкі і пачуцці ўсяго многамільённага совецкага народа.

«Няхай жыве знешняя палітыка Совецкага ўрада, палітыка міру паміж народамі і забеспячэння безапаснасці нашай радзімы!»

У чэсць гэтай мудрай сталінскай знешняй палітыкі, у чэсць яе натхніцеля — таварыша Сталіна і главы Совецкага ўрада таварыша Молатава рабочыя, калгаснікі, інтэлігенцыя—дзесяткі тысяч калектываў, праходзячых перад маўзалеем, праўзгалашаюць магутнае, дружнае «ура».

4 гадзіны 35 мінут. Ясны, сонечны дзень змяніўся лістападаўскім змрокам. Над крэмлёўскай вежай загарэліся яркія рубінавыя

Магутнасць і адзінства совецкага народа

У дэманстрацыі працоўных Мінска ўдзельнічала 120 тысяч чалавек.

МІНСК, 7 кастрычніка. (ТАСС). Раніца, але вуліцы сталіцы Совецкай Беларусі ўжо заліты патокам людзей.

На трыбунах шматлікія госці, стаханаўцы прадпрыемстваў, вучоныя, пісьменнікі, артысты, дэлегацыі працоўных заходніх абласцей рэспублікі, прадстаўнікі брацкай Літоўскай ССР. На ўрадавай трыбуне кіраўнікі ЦК КП(б)Б і ўрада БССР. Камандуючы войскамі Заходняй асобай ваеннай акругі генерал-палкоўнік танкавых войск Герой Совецкага Саюза Паўлаў узнімаецца на трыбуну і звяртаецца з прывітальнай прамовай да байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Заходняй асобай ваеннай акругі, да ўсіх працоўных Беларускай ССР.

Войскі ідуць пад незмаўкаючым громам прывітанняў. Не сціхае чырвонаармейскае «ура» у чэсць

зенітныя гарматы. Яны наглядна дэманстрыруюць усесакрушальную сілу непераможнай арміі соцыялізма.

Выклікаючы захапленне прысутных, праходзяць пражэктарныя, інжынерныя часці. Бесканечнай вераніцай па два ў рад рушацца танкі.

Паветраны парад не мог адбыцца з-за дрэннага надвор'я (снегапад).

Ваенны парад закончан. На плошчу з музыкай і з песняй выходзяць калоны радаснай, шчаслівай дзетвары. Яны славяць партыю большэвікоў, таварыша Сталіна.

Апошнімі прайшлі праз плошчу фізкультурнікі горада, выканаўшыя перад трыбунамі абаронныя і гімнастычныя практыкаванні.

120 тысяч працоўных сталіцы БССР у дзень XXIII гадавіны Вя-

У МІНСКУ АДКРЫЛАСЯ ВЫСТАЎКА „ЛЕНІН І СТАЛІН — АРГАНІЗАТАРЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ"

* * *

КВІТНЕЕ МАСТАЦТВА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

У чэрвені гэтага года адбылася дэкада беларускага мастацтва ў Маскве. Пасланцы з'еднанага беларускага народа прадэманстыравалі перад грамадскасцю сталіцы, перад партыяй і вялікім Сталіным росквіт соцыялістычнай культуры нашай рэспублікі, дасягнуты пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна. Беларускі народ бліскуча вытрымаў экзамен на мастацкую спеласць, на званне высокакультурнага, таленавітага народа. Высокая ацэнка нашага мастацтва — узнагароджанне многіх удзельнікаў дэкады ордэнамі Саюза ССР — натхніла мастакоў і пісьменнікаў, артыстаў і кампазітараў на новыя творчыя поспехі ў славу нашай радзімы. Дэкада з'явілася магутным стымулам да далейшага росквіту творчых сіл народа.

У культурным жыцці нашай рэспублікі адбылася яшчэ адна выдатная падзея: у дні святкавання XXIII гадавіны Вялікага Кастрычніка ў Мінску адкрылася выстаўка выяўленчага мастацтва «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Сёння мы друкуем матэрыялы, якія раскажуць чытачу аб гэтай выдатнай выстаўцы. Шматлікія экспанаты выстаўкі — жывапісь, скульптура, графіка, макеты і здымкі архітэктурных пабудоў, вышыўкі, разьба па металу і дрэву, славутыя слуцкія паясы, вытканыя кауры, коўдры, ручнікі і т. д.—у мастацкай форме адлюстроўваюць гераічнае мінулае і шчаслівае сёння беларускага народа, які ў брацкай сям'і народаў Савецкага Саюза будуе новае жыццё. Выстаўка паказвае геніяў чалавецтва Леніна і Сталіна, як арганізатараў і тварцоў гэтага новага жыцця.

Беларускі народ атрымаў сваю дзяржаўнасць толькі ў выніку Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Мудрыя правадыры народаў Ленін і Сталін былі непасрэднымі арганізатарамі, стваральнікамі гэтай дзяржаўнасці. Па ўказанню вялікага Сталіна пальчі нашай гераічнай Чырвонай Арміі пераможным маршам прайшлі ў верасні 1939 года Заходнюю Беларусь, вызваліўшы сваіх аднакроўных братоў з-пад прыгнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў, назаўсёды з'еднаўшы ў адзіную сям'ю шматмільённы беларускі народ. Імены ім, любімым правадырам і настаўнікам, абавязан беларускі народ сваім шчаслівым і радасным жыццём. Вось чаму вобразы, Леніна і Сталіна запечатлёны ў лепшых мастацкіх палотнах выстаўкі. Яны натхнялі нашых мастакоў у час плённай работы.

Выстаўка маляўніча паказвае, якіх вялікіх творчых поспехаў дабілася выяўленчае мастацтва БССР пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі. У БССР выраслі выдатныя кадры жывапісцаў, скульптараў, архітэктараў, рэзчыкаў па дрэву і т. д. Многія з іх — ордэнаносцы А. В. Грубе, Н. А. Пашкевіч, В. В. Волкаў, Е. А. Зайцаў, М. А. Керзін, М. І. Манасзон і іншыя — вядомы не толькі ў нашай рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. Вырасла таленавітая моладзь, якая ўпершыню прадстаўлена на выстаўцы.

Значных поспехаў дабілася мастацтва вызваленых заходніх абласцей БССР. Атрымаўшы ўсе магчымасці для творчага росту, яны актыўна ўключыліся ў работу па стварэнню твораў, вартых нашай вялікай эпохі.

На выстаўцы прадстаўлены работы многіх беластоцкіх мастакоў. Работы скульптараў Рапапорта і Месера, мастакоў Кашчанчоўскага, Ляндаў, Краеўскага, братоў Зайдэнбойтэль і іншых сведчаць аб значных талентах аўтараў. У нашай вобласці выявілены многія мастакі-самавучкі, з якімі сістэматычна праводзіць работу абласны Дом народнай творчасці.

За адзін толькі год існавання савецкай улады ў нашай вобласці створаны Дамы мастака і народнай творчасці, мастацкае вучылішча, адкрыты аддзяленне камбіната выяўленчага мастацтва і філіял саюза мастакоў.

Беластоцкія мастакі і скульптары ўключыліся зараз у падрыхтоўку да ўсесаюзнай выстаўкі «Наша радзіма». Уліўшыся ў дружную сям'ю савецкіх работнікаў мастацтва, яны ўпэўнена пойдуць па шляху далейшага ідэйнага і мастацкага росту. Радзіма чакае ад іх новых высокамастацкіх твораў.




Мастак М. І. Манасзон.

Фота Б. Ханіна. Фотахроніка БЕЛТА.

Старшыня Саюза савецкіх мастакоў БССР, ордэнаносец І. Рубінштэйн.

Фота І. Шышко. Фотахроніка БЕЛТА.



На здымку: скульптурная група «Сталін і Орджанікідзе ў штабе Заходняга фронта», работы скульптара А. П. Арлова.

Фота М. Савіна. Фотахроніка БЕЛТА.

Вялікая чэсць для савецкага мастака

У новым мастацкім палатне, якое я прадставіў на выстаўку, адлюстравана роля вялікіх правадыроў народаў у барацьбе за вызваленне працоўных Беларусі. Тэма маёй карціны — выступленне Я. М. Свердлова на гістарычным пасяджэнні ЦК большэвікоў 23 кастрычніка 1917 года з дакладам аб становішчы ў Мінску. Многа ўвагі і творчага натхнення я аддаў рабоце над вобразамі кіраўнікоў Кастрычніка, геніяў чалавецтва Леніна і Сталіна і іх баявых саратнікаў — Дзяржынскага, Свердлова, Урыцкага.

Прышлося многа працаваць над гістарычнымі матэрыяламі для больш рэалістычнага адлюстравання праўдзівасці. Работа над гэтай карцінай мяне вельмі захапіла. Працаваць над такой тэмай — вышэйшая чэсць для савецкага мастака. І закончанне карціны з'явілася для мяне вялікім святам.

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР — мастак-ордэнаносец **В. В. Волкаў.**

Гераіка вялікага беларускага народа

Я прадставіў на выстаўку «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці» дзве свае работы: «Врасплох» і «Сустрэча танкістаў у Заходняй Беларусі».

Карціна «Врасплох» адлюстроўвае барацьбу беларускага народа з белапольскімі акупантамі, зараджэнне першых партызанскіх атрадаў і іх гераічную барацьбу ў тылу ворага. У карціне паказан момант нечаканага нападу партызан на белапалякаў.

Натхнёна працаваў я над другой карцінай —«Сустрэча танкістаў у Заходняй Беларусі». Яна паказвае радасную сустрэчу працоўных вызваленага горада з доблеснымі воінамі Чырвонай Арміі... Першы савецкі танк адразу-ж акружылі жыхары. З вялікім захапленнем слухаюць яны расказ чырвонаармейца аб шчаслівым жыцці ў краіне соцыялізма.

Мною напісаны таксама эцюды і пейзажы. Зараз я рыхтуюся да выстаўкі «Наша радзіма».

Мастак-ордэнаносец **М. І. Манасзон.**

* * *

ТВОРЧАЕ НАТХНЕННЕ

Выстаўка «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці—вялікая падзея ў жыцці беларускага народа. На нас, работнікаў мастацтваў, выпала пачэсная задача — у яркіх, хвалюючых карцінах, скульптурах, малюнках паказаць, як пры непасрэдным удзеле вялікіх геніяў чалавецтва, маршалаў рэволюцыі Леніна і Сталіна нарадзілася, прайшла вялікі гістарычны шлях Савецкая Беларусь, як яна расквітнела пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Працуючы каля двух год над стварэннем скульптур для выстаўкі, асабліва вялікае творчае натхненне адчуваў я пры стварэнні скульптуры «Сталін — тварэц Канстытуцыі». У гэтай рабоце я хацеў адлюстраваць момант, калі вялікі правадыр народаў, абдумаўшы важнае дзяржаўнае пытанне, прыняў пэўнае рашэнне. Да гэтай тэмы я буду яшчэ многа раз зварочвацца.

На выстаўку мною прадстаўлены таксама бюсты геніяў чалавецтва — Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна, фігуры Свердлова і Орджанікідзе.

Зараз я працую над скульптурамі перадавых людзей нашай ордэнаноснай рэспублікі. Мною зроблены партрэты народных паэтаў БССР Янкі Купалы і Якуба Коласа, народнай артысткі СССР Л. П. Александроўскай, Героя Савецкага Саюза т. Копец і інш.

Мае планы на будучае —стварыць вобраз вялікага Сталіна і герояў нашых дзён. У 1941 годзе буду працаваць над скульптурай В. М. Молатава і партрэтамі перадавых людзей рэспублікі. Апрача таго я прыступлю да стварэння статуі заснавальніка друкарскай справы на Беларусі — Францыска Скарыны.

Заслужаны дзеяч мастацтваў скульптар-ордэнаносец **З. І. Азгур.**

Мы горды і шчаслівы

Мы горды і шчаслівы тым, што наша калектыўная работа — гобелен «Лявоніха» з'яўляецца адным з экспанатаў цудоўнай выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Гобелен «Лявоніха» — гэта адлюстраванне радаснага жыцця калгаснага сялянства. У віхры любімага народнага танца кружацца маладыя і пажылыя калгаснікі і калгасніцы.

Работы многіх з нас ужо не раз былі прадстаўлены на выстаўках. Работы вышывальшчыцы т. Лукошкінай (Віцебск) былі прадстаўлены на сусветнай выстаўцы у Нью-Йорку, лепшыя работы тт. Данілец, Грыгор'евай, Ступінай, Сяліцкай і др. экспаніраваліся ў Маскве на выстаўцы выяўленчага мастацтва БССР у час дэкады беларускага мастацтва. І кожны раз пасля таго, як грамадскасць робіць ацэнку нашаму майстэрству, мы адчуваем новы прыліў творчых сіл, яшчэ больш жаданне працаваць на карысць соцыялістычнай радзімы.

Г. А. Ступіна, П. Ф. Лукшкіна, А. В. Саломенік, К. І. Сяліцкая, А. Г. Данілец, В. А. Сурына, Д. А. Грыгор'ева.

Вобраз вялікага Сталіна натхняе мяне на новую творчую работу

4 годы таму назад я стаў займацца інкрустацыяй. У свабодны ад работы час я аддаюся гэтай справе і з кавалачкаў дрэва складаю любімыя вобразы кіраўнікоў партыі і ўрада. У час дэкады беларускага мастацтва ў Маскве мною былі прадстаўлены на выстаўку дзве работы — партрэт таварыша Сталіна і партрэт «Сталін і Варашылаў».

На працягу 5 месяцаў з вялікім натхненнем працаваў я над каляровым партрэтам таварыша Сталіна. Партрэт набран з 610 кавалачкаў дрэва — палісандры, бука, чынары, арэха, карагача, грушы і іншых парод. Гэта работа прадстаўлена зараз на выстаўцы «Ленін і Сталін— арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Працуючы над дарагім мне вобразам, мне хацелася адлюстраваць тэму «Сталін — трыбун». Наколькі мне гэта ўдалося, ацэніць савецкая грамадскасць.

З новым пачуццём радасці, з яшчэ большай энергіяй я буду ўдасканальваць сваё майстэрства ў галіне інкрустацыі.

Рабочы Мінскай дрэваапрацоўчай арцелі імені 2-й пяцігодкі.

Н. А. Шудрык.



Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, скульптар ордэнаносец М.А. Керзін. Фота М. Савіна. Фотахроніка БЕЛТА.

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, скульптар-ордэнаносец З. І. Азгур. Фота І. Другуня. Фотахроніка БЕЛТА

МАГУТНЫ РОСКВІТ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА

8 лістапада ў памяшканні карціннай галерэі ў Мінску адкрылася мастацкая выстаўка «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Яна адлюстроўвае вялікія і слаўныя дзеянні беларускага народа, зробленыя ім пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ў барацьбе за сваё вызваленне, за пабудову соцыялізма, рост і росквіт беларускай культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па змесце. Яна ярка паказвае вялікіх правадыроў і настаўнікаў—Леніна і Сталіна, як тварцоў беларускай дзяржаўнасці.

Да Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў Беларусі было толькі тры мастакі-прафесіяналы. Гэта—таленавіты майстар кісці Пэн і мастакі Кругер і Альперовіч. Царызм падаўляў усякае праўленне нацыянальнай творчасці, душыў народныя таленты і не даваў магчымасці да навукі і культуры.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя назаўсёды знішчыла ўсякі нацыянальны ўціск і стварыла сапраўднае садружаства ўсіх народаў СССР. Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, вялікіх правадыроў — Леніна і Сталіна шырока разгарнулася савецкае будаўніцтва ў нацыянальных рэспубліках СССР. Расцвіла культура, нацыянальная па форме і соцыялістычная па змесцу. З глыбінь народных мас падняліся тысячы і тысячы талентаў. Пролетарская рэволюцыя і савецкая ўлада стварылі выключныя ўмовы для іх развіцця і творчай работы.

Ужо з першых год рэволюцыі інтэнсіўна развіваецца соцыялістычнае мастацтва беларускага народа. Маладыя мастакі, якія падняліся з глыбінь народных мас, за кароткі час стварылі свае глыбока народныя творы соцыялістычнага мастацтва — мастацтва, якое кліча і натхняе савецкіх людзей на новыя і новыя перамогі ў імя комунізма. І іменна так ацанілі майстэрства беларускіх мастакоў у Маскве ў часе дэкады беларускага мастацтва. «Асноўная рыса творчасці беларускіх мастакоў у тым, — пісала «Праўда», — што яны жывуць адзінымі мыслямі і пачуццямі з сваім народам. Падзеі, хвалюючыя народ, яго святы, яго перамогі знаходзяць сваё адлюстраванне ў творах беларускіх мастакоў».

Першая тэматычная выстаўка ў Маскве ў часе дэкады беларускага мастацтва, несумненна, прадстаўляла значную з'яву ў развіцці выяўленчага мастацтва БССР. Гэта выстаўка атрымала высокую, заслужаную ацэнку ў маскоўскім друку і ў савецкай грамадскасці.

Выстаўка «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці» з'яўляецца буйнай перамогай усяго беларускага мастацтва. Запечатлеў вобраз беларускага народа, мужнага, моцнага, які пад кіраўніцтвам правадыроў — Леніна і Сталіна пераможна будуе сваю дзяржаву, сваё новае жыццё — вось асноўная мысль выстаўкі.

На выстаўцы прадстаўлены ўсе віды выяўленчага мастацтва: архітэктура, скульптура, жывапісь, графіка, народная творчасць.

Рад фатаграфічных здымкаў з лепшых будынкаў знаёміць з развіццём савецкага стыля ў архітэктурным будаўніцтве БССР. Мы бачым, як паступова, побач з творамі старэйшых майстраў беларускай архітэктуры (заслужаны дзеяч мастацтва Лангбард, Весніні і др.), вырастаюць новабудоўлі маладых беларускіх архітэктараў, заслужанага дзеяча мастацтва БССР А. П. Воінава, Вараксіна, Маклецовай і маладых архітэктараў — Заборскага, Гусева і др.

Лепшы майстар скульптурнага партрэта З. І. Азгур стварыў велічны вобраз таварыша Сталіна. Яго тэма — «Сталін-мысліцель». У дзейнасці таварыша Сталіна, у яго працах, так-жа сама як у сваім часе у дзейнасці Леніна, сканцэнтраван увесь вопыт, уся мудрасць партыі большэвікоў, веліч нашага народа. Адна з самых характэрных рыс нашага правадыра як мысліцеля — гэта рэволюцыйная смеласць навуковых абагульненняў, крышталяная яснасць і незвычайная сіла логікі. Гэта мысль вельмі добра перадана ў вобразе любімага правадыра і настаўніка, створаным З. І. Азгурам. Гэты твор з'яўляецца вялікай творчай перамогай скульптара. Апрача таго, на выстаўцы тав. Азгур прадставіў цэлым радам партрэтаў: таварыша Орджанікідзе, народных паэтаў БССР Янкі Купалы і Якуба Коласа, заснавальніка друкарскай справы на Беларусі Скарыны і др. Лепшай работай скульптара Азгура па тэхніцы, глыбіні трактоўкі і жыццёвасці выражэння з'яўляецца надаўна закончаны партрэт двойчы Героя Савецкага Саюза Копеца.

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Грубе прадставіў на выстаўцы скульптурамі: «Ленін на трыбуне» і выразаная з дрэва трохметровай фігурай «Беларусь». У гэтай скульптуры Грубе імкнецца ўскрыць рэволюцыйную сілу, закладзеную ў нетрах народных беларускіх мас.

Скульптар Бэмбель прадстаўлен барэльефнымі работамі, у галіне якіх ён з'яўляецца адным з буйнейшых майстраў Саюза. Складаная скульптурная група «Штаб першай коннай арміі» (Варашылаў, Будзённы, Шчаденко) належыць творчасці А. К. Глебава, майстра ў галіне батальнай скульптуры.

Скульптар Орлоў прадстаўлен на выстаўцы двума работамі —«Пагранічнік і калгасніца» і «Сталін і Орджанікідзе на Заходнім фронце». Яго скульптура «Пагранічнік і калгасніца» была ўжо раней прадстаўлена на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы і стала шырока вядома савецкай грамадскасці. Маладыя скульптар т. Жораў даў надзвычайна цікава задуманую кампазіцыю ў вялікай трохфігурнай групе «Орджанікідзе ў размове з Барысавам». Звяртае ўвагу скульптура Рапапорта «Вызваленне Заходняй Беларусі» і скульптурныя партрэты Бразера.

Сярод шматлікіх экспанатаў жывапісі перш за ўсё трэба адзначыць вялікую кампазіцыю старэйшага мастака Волкава на тэму «Выступленне таварыша Свердлова на пасяджэнні ЦК большэвікоў у 1917 годзе з дакладам аб становішчы ў Беларусі». Прадстаўленая на выстаўцы карціна мастака Пашкевіча «Беларускія партызаны на прыёме ў таварыша Сталіна ў Рэўваенсовеце Заходняга фронта» жыццёва і цэльна задумана. Гэтае таленавіта выканаанае палатно ўвасабляе вобраз беларускага народа. Карціна Зайцава «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск» ставіць перад сабой задачай творча ўвасобіць слаўную эпапею вызвалення Беларусі Чырвонай Арміяй.

Выстаўка з'яўляецца яркім сведчаннем незвычайнага росту талентаў сярод нашай моладзі. Мастак Дакальская сваёй карцінай «Белапольскія акупанты» дае насычаны глыбокім зместам твор. Яе пейзажы звяртаюць на сябе ўвагу сваёй цэльнасцю і лірызмам.

Малады мастак Манасзон прадстаўлен радам палотнаў. Адной з лепшых карцін выстаўкі з'яўляецца яго карціна «Сустрэча танкістаў». Верна задумана і праўдзіва выканана карціна маладога мастака Касмачова — «Падпольная друкарня», паказваючая работу большэвікоў у падполлі. Звяртае на сябе ўвагу арыгінальнасцю тэматыкі работа мастака Заборава. Яго карціна «Дзе сын?» паказвае момант рэўнічых палініцэйскіх да бацькі для арышту сына.

Апрача вышэйпамянёных твораў, на выстаўцы багата прадстаўлены надзвычайна цікавыя па тэматыцы і па прафесіянальных дасягненнях работы маладых беларускіх мастакоў, якія сведчаць аб вялікім росквіце беларускага выяўленчага мастацтва. Сярод шматлікіх твораў пейзажнай жывапісі выдзяляюцца работы старэйшага беларускага мастака-пейзажыста Кудрэвіча, майстра акварэльнай жывапісі Лейтмана, мастака Дучыца і другіх.

Багата прадстаўлена графіка. Гембіцкі паказвае серыю гравюр на дрэве на тэмы грамадзянскай вайны. Таленавіта выкананы гравюры Краеўскага — майстра гратэскавага стыля.

Выстаўка мае вялікі аддзел работ майстраў народнай творчасці. Тут прадстаўлены ўзоры высокамастацкай разьбы па дрэву, цудоўныя вышыўкі, ткацтва. Асабліва трэба адзначыць работы маладых скульптараў - самавучак —15-гадовага Адама Засціцкага, 17-гадовага Робермана і др.

Выстаўка «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці» сведчыць аб велізарных творчых поспехах выяўленчага мастацтва БССР. Яна з'яўляецца багатай школай абмену вопытам. Падрабязны крытычны аналіз творчасці кожнага мастака дасць новы стымул для далейшага росту выяўленчага мастацтва рэспублікі. На пастаянным увагу і клопаты партыі і ўрада аб працаўнікоў мастацтва беларускія мастакі адкажуць стварэннем новых ярчайшых палотнаў, дастойных вялікай эпохі Леніна—Сталіна.

М. Керзін, скульптар-ордэнаносец.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты ў абласны Совет дэпутатаў працоўных

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ СОВЕЦКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 4 ПА ВЫБАРАХ У БЕЛАСТОЦКІ АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 68, 69, 70, 74 Палажэння аб выбарах, **пастанавіла:**

На падставе артыкула 73 Палажэння аб выбарах, зарэгістрыраваць для балатыроўкі ў Беластоцкі абласны Совет дэпутатаў працоўных па Савецкай выбарчай акрузе № 4 вылучанага агульным сходам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых плюшавай фабрыкі гор. Беластока, дзе прысутнічала 450 чалавек, кандыдатуру тав. **Ленартоўскага Сцяпана Станіслававіча**, 1886 года нараджэння, беспартыйнага, рабочага-ткача фабрыкі.

На падставе арт. 78 Палажэння аб выбарах, кандыдатуру тав. **Ленартоўскага С. С.** уключыць у выбарчы бюлетэнь па Совецкай выбарчай акрузе № 4 гор. Беластока.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі І. КЛУБНІКАЎ
Намеснік старшыні В. ПІСАРЭВІЧ
Сакратар М. НОВАГРУДСКІ
Члены: І. БЕРЫЛА А. ПАЛІШЧУК, С. ЭПШТЭЙН, Ф. ВОЛЯНСКІ, І. ЛІТВІНА

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ СЛАБАДСКОЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 6 ПА ВЫБАРАХ У БЕЛАСТОЦКІ АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 68, 69, 70, і 74 Палажэння аб выбарах, **пастанавіла:**

На падставе арт. 73 Палажэння аб выбарах зарэгістрыраваць для балатыроўкі ў Беластоцкі абласны Совет па Слабадской выбарчай акрузе № 6 вылучаную агульным сходам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых 5-га тонкасуконнага камбіната, на якім прысутнічала 450 чалавек, кандыдатуру тав. **Каеўскага Зігізмунда Пятровіча**, 1897 года нараджэння, беспартыйнага, рабочага, які зараз працуе намеснікам начальніка ткацкай фабрыкі 5-га камбіната г. Беластока.

На падставе арт. 78 Палажэння аб выбарах, кандыдатуру тав. **Каеўскага З. П.** уключыць у выбарчы бюлетэнь па Слабадской выбарчай акрузе № 6.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі М. ШАЛІКАЎ
Намеснік старшыні Г. ТЫКОЦКІ
Члены: М. ГЕДЗІЧ, І. СПІРЫН, Э. ВЕНГЕР, Я. БАЧАЛОЎСКАЯ, К. САБАЛЕЎСКАЯ.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ПЕРШАМАЙСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 8 ПА ВЫБАРАХ У БЕЛАСТОЦКІ АБЛАСНЫ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. арт. 68, 69, 70 і 74 Палажэння аб выбарах, **пастанавіла:**

На падставе арт. 73 Палажэння аб выбарах, зарэгістрыраваць для балатыроўкі ў Беластоцкі абласны Совет па Першамайскай выбарчай акрузе № 8, вылучаную агульным сходам рабочых, служачых і інтэлігенцыі Беластоцкага паравознага дэпо, Беластоцкай чыгункі, на якім прысутнічала 450 чалавек, кандыдатуру тав. **Партынскага Люцыяна Іванавіча**, 1912 года нараджэння, беспартыйнага, які працуе памочнікам машыніста беластоцкага дэпо.

На падставе арт. 78 Палажэння аб выбарах, кандыдатуру тав. **Партынскага Л. І.** уключыць у выбарчы бюлетэнь па Першамайскай выбарчай акрузе № 8.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі М. ГАРБУНОВА
Сакратар Н. КЛЮКО
Члены: М. НОВІК, І. МУШЫНСКІ, Г. КАПУСЦІНА

Перадвыбарчыя сходы ўпаўнаважаных

На перадвыбарчай нарадзе 16-й выбарчай акругі гор. Ломжы

У зале Ломжынскага райкома партыі 4-га лістапада было ажыўлена і многалюдна. Сюды сабраліся ўпаўнаважаныя 16-й выбарчай акругі — перадавыя людзі вытворчасці: стаханаўцы ватнай фабрыкі, члены арцелей, інтэлігенцыя горада. Яны прыйшлі сустрэцца са сваім кандыдатам у абласны Совет дэпутатаў працоўных тав. Паповым Філіпам Іосіфавічам — сакратаром Беластоцкага абкома партыі.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі тав. Вадап'янаў расказаў аб велізарных перамогах, атрыманых нашай краінай пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і правадыра народаў таварыша Сталіна, аб росквіце культуры і соцыялістычнага дэмакратызма.

На сканчэнні даклада адзін за другім узнімаюцца на трыбуну прадстаўнікі выбарчай акругі. У сваіх прамовах яны гаварылі аб тым, што тав. Папоў — верны сын працоўнага народа і большэвіцкай партыі, членам якой ён з'яўляецца з 1926 года, выхадзец з сям'і селяніна-бедняка.

На нарадзе выступіў кандыдат у дэпутаты тав. Папоў. Ён расказаў сабраўшымся аб сваім жыццёвым шляху і заверыў працоўных, што аддасць свае сілы і здольнасці, каб апраўдаць давер'е выбаршчыкаў.

П. Паўлаў.

На перадвыбарчай нарадзе Совецкай выбарчай акругі

Каля 150 чалавек прыбыла на перадвыбарчы сход упаўнаважаных Совецкай выбарчай акругі па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных. У гэтай акрузе вылучаны кандыдатам у абласны Совет рабочы беластоцкай плюшавай фабрыкі, стары ткач, Сцяпан Станіслававіч Ленартоўскі.

Тав. Ленартоўскаму зараз 54 годы. У яго 40-гадовы вытворчы стаж. Усё сваё свядомае жыццё ён аддаў рэволюцыйнай барацьбе. Не адзін год правёў ён у турме.

З глыбокай пашанай выслухалі прысутныя аўтабіяграфію тав. Ленартоўскага, расказаную ім самім.

Выступіўшыя ўпаўнаважаныя аднадушна заявілі, што тав. Ленартоўскі поўнасцю дастойны высокага звання дэпутата Беластоцкага абласнога Совета.

Прадстаўнік калектыва рабочых і служачых плюшавай фабрыкі ў сваёй прамове падкрэсліў, што тав. Ленартоўскі, працуючы на прадпрыемстве, паказаў сябе добрым стаханаўцам. Ён сістэматычна перавыконвае сваю норму, актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці, з'яўляецца старэйшынай цэхавога камітэта і цэхавым агітатарам.

Акруговы перадвыбарчы сход аднадушна адобрыў кандыдатуру тав. Ленартоўскага. У прынятым звароце да выбаршчыкаў сход заклікае іх у дзень выбараў аддаць свае галасы за дастойнага кандыдата працоўных Сцяпана Станіслававіча Ленартоўскага.

З велізарным уздымам удзельнікі схода прынялі прывітальнае пісьмо правадыру народаў СССР таварышу Сталіну.

Святкаванне ў Беластоку XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі

Грандыёзны парад узброеных сіл. 75-тысячная дэманстрацыя працоўных

Рана прачнуўся святочны горад. І ў гэты ранні час тут, на заходнім фарпосце совецкай краіны, чуваць біццё сэрца вялікай радзімы.

З песнямі і музыкай, з чырвонымі сцягамі і лозунгамі барацьбы за яшчэ лепшую будучыню, з партрэтамі вялікага Сталіна і сталінскіх саратнікаў, з кветкамі ў руках і чырвонымі бантамі на грудзях збіраліся працоўныя на фабрыках, заводах, установах, майстэрнях, збіраліся вучні ў школах на дэманстрацыю ў чэсць гадавіны Кастрычніка. Увесь Беласток выйшаў на вуліцы, каб прадэманстраваць перад соцыялістычнай радзімай, перад большэвіцкай партыяй свае поспехі ў будаўніцтве новага жыцця, паказаць гаспадарчыя, культурныя і палітычныя дасягненні, заверыць вялікага Сталіна ў сваёй гатоўнасці аддаць усе намаганні на памнажэнне сілы і росквіт любімай радзімы.

Ужо к 10 гадзінам раніцы ўсе калектывы працоўных былі ў зборы, гатовыя рушыць на плошчу Совецкую, на дэманстрацыю. З краю ў край нясліся радасныя песні — песні, з якімі весяляцца і святкуюць, працуюць і ідуць на бой, песні, што славяць жыццё і нясуцца далёка пераможным заклікам.

Яшчэ раней падрыхтаваліся к параду вайсковыя часці. На вуліцах і плошчы сталі цесна самкнутыя чатырохкутнікі войск у чаканні пачатку парада. Генерал-лейтэнант тав. Раманоўскі аб'язджае на кані выстраеныя ў бездакорным страі войскі і віншуе іх з святам XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Громам пракатваецца па жалезных шарэнгах адказнае «ура». Тав. Раманоўскі звяртаецца з гарачай і яркай прамовай да байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Беластоцкага гарнізона. Яго прамова пакрываецца грамавым трохразовым «ура», музыкай пролетарскага гімна і кананадай гарматнага салюта.

Затым войскі накіроўваюцца па Совецкай вуліцы да Совецкай плошчы. На трыбуне—прадстаўнікі вышэйшага камандавання, сакратары абкома партыі тт. Кісялёў, Папоў, Савалаў і Сямёнаў, старшыня абласнога выканаўчага камітэта тав. Мальцаў, сакратар Беластоцкага гаркома партыі тав. Раманаў, старшыня гарвыканкома тав. Ражноўскі, дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР тт. Дзьячук, Пятроўская, Іваноў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

Першай міма трыбуны праходзіць пяхота. Чоткі поступ жалезных радоў пад гукі зводнага аркестра адбівае размераны рытм марша. З напоўным узбраеннем нагатове, жалезным крокам праходзяць старыя байцы, якія прайшлі агні баёў, зведалі ярасць схваткі з ворагам і пазналі навуку перамагаць. Ідуць маладыя чырвонаармейцы, якія зусім нядаўна атрымалі зброю. Але і тыя і другія аднолькава цвёрда і ўпэўнена сёння праходзяць перад вачыма працоўных, як гордасць і краса, як надзея і сіла нашай радзімы, перад якой не ўстаіць ніякі вораг. Доўга ідуць суцэльнай масай байцы, трымаючы ў руках ласкава грозную зброю, знішчальную сілу якой не раз паспыталі ворагі совецкай радзімы.

— Няхай жыве наша родная Чырвоная Армія! — несецца воклік з трыбуны.

— Няхай жыве нарком абароны таварыш Цімашэнка!

— Няхай жыве таварыш Варашылаў!

— Няхай жыве вялікі правадыр таварыш Сталін!

І з соцень магутных грудзей зноў і зноў грыміць «ура» у чэсць тых, хто мудра і ўмела вадзіў у бой, хто пастаянна клапоціцца аб аснашчэнні і магутнасці Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, за кім гатовы ісці байцы ў новыя біт вы за незыблемасць і чэсць любімай радзімы.

Прайшла пяхота, і здалёк па вуліцы загрукацела цяжкай сталлю артылерыя — дальнабойная і гаўбічная, конная і матарызаваная. Доўга любаваліся працоўныя велізарнымі гарматамі на трактарным прычэпе.

Толькі сціх грукат гармат, як з-за павароту выскачылі сухапутныя караблі, магутныя танкі. Гэтыя слаўныя машыны выпрабаваны не ў адным баі, іх вядуць умелыя, моцныя рукі танкістаў.

У 12 гадзін закончыўся ваенны парад, які прадэманстраваў сабой сілу і магутнасць чырвоных войск, гатовых на любыя справы ў імя дарагой соцыялістычнай радзімы. Самалёты чакалі парада, але з-за дрэннага надвор'я яны не падняліся ў паветра.

Пачалася дэманстрацыя працоўных Беластока. Яе адкрываюць дзеці — гэтыя кветкі нашай краіны, змена, якая пераймае ў старой гвардыі большэвіцкі сцяг барацьбы за комунізм. Першай ідзе 14-я сярэдняя школа. Гарыць кумач у калоне, смяецца бацькоўскай усмешкаю Сталін з велізарнага партрэта. Гучна, з вялікім захапленнем крычаць юныя галасы «ура» у чэсць таго, хто даў ім шчаслівае дзяцінства, хто даў ім магчымасць вучыцца, даў свабоду і працу іх бацькам. «Дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае дзяцінства» — такі голас юных сэрцаў, напісаны на лозунгах калон усіх школ.

За школьнікамі ідуць студэнты педагагічнага інстытута вялікі атрад будучых совецкіх настаўніцкіх кадраў. Бадзёра і прыгожа праходзяць яны чоткім строем, юнакі і дзяўчаты, дзеці рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі, радасныя шчасцем сваім — вялікім правам на асвету. За імі — студэнты гандлёвага, політэхнічнага тэхнікума, вучні школы тэкстыльшчыкаў, — зязяючыя шчаслівыя твары, якім адкрыты светлыя перспектывы ў жыццё.

Увагу ўсіх прыкоўвае арыгінальна аформленая калона 6-га тэкстыльнага камбіната. Рухаецца велізарная выбарчая урна, заклікае вялікі лозунг: «Усе на выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных». З радоў дэманстрантаў раздаюцца прывітанні ў чэсць вялікага Сталіна, у чэсць совецкай улады, у чэсць вызваліцельніцы Чырвонай Арміі.

Слаўных совецкіх тэкстыльшчыкаў вітаюць з трыбуны іх выбраннікі — дэпутат Вярхоўнага Совета СССР Марыя Дзьячук і дэпутат Вярхоўнага Совета БССР тав. Пятроўская, і ў адказ ім грыміць «ура» у чэсць свабоднай працы.

— Дадзім совецкай краіне больш сукна і лепшай якасці!

— Пераўтворым Беласток у другое Іванава! — гучаць лозунгі з калон тэкстыльшчыкаў. Яны слаўна папрацавалі ў гэтым годзе. Совецкая краіна атрымала ад шарсцянікаў і плюшавікоў Беластока 10.140.000 метраў сукна і 220.480 метраў плюшу. Гадавое заданне — даць краіне 12 мільёнаў метраў сукна—будзе выканана з чэсцю.

У магутных калонах 75-тысячнай дэманстрацыі працоўных горада Беластока ішлі тэкстыльшчыкі, чыгуначнікі, скураапрацоўшчыкі, фанершчыкі, ліцейшчыкі, шклазаводцы, сувязісты, будаўнікі, харчавікі, швейнікі, рабочыя мясцовай і саматужна-кааператыўнай прамысловасці, настаўнікі, медыцынскія работнікі, майстры мастацтваў, студэнты, совецкія служачыя — вялікі атрад рабочага класа і совецкай інтэлігенцыі. Дэманстранты ішлі з лозунгамі Цэнтральнага Камітэта партыі большэвікоў, з песнямі пра сваё вызваленне і шчасце, з хвалой і ўдзячнасцю совецкай уладзе, большэвіцкай партыі і вялікаму мудраму правадыру любімаму Сталіну. Беласток не бачыў такой урачыстай арганізаванасці, такой дружнай згуртаванасці працоўных, такога захаплення і радасці, з якімі прайшла гэта магутная дэманстрацыя ў чэсць XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

І. Клінаў.

Урачыстае пасяджэнне ў гарадскім тэатры

6-га лістапада ў памяшканні гарадскога тэатра адбылося ўрачыстае пасяджэнне Беластоцкага гарадскога совета сумесна з партыйнымі, профсаюзнымі, комсамольскімі і грамадскімі арганізацыямі працоўных горада, прысвечанае XXIII гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Пад бурныя апладысменты ў пачотны прэзідыум выбіраюцца таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Жданаў, Хрушчоў, Берыя, Шверник.

Старшынствуючы тав. Ражноўскі прадастаўляе слова для даклада сакратару Беластоцкага гаркома партыі тав. Раманаву. Дакладчык гаворыць аб вялікіх перамогах краіны соцыялізма за 23 годы.

Вялікіх поспехаў дасягнулі за год совецкай улады народы Заходняй Украіны і Беларусі. Да непазнавальнасці змяніўся наш горад Беласток. Карэнным чынам рэканструявана ўся прамысловасць. На месцы дробных, паўразбураных капіталістычных фабрык створаны буйныя соцыялістычныя тэкстыльныя камбінаты і фабрыкі, адноўлена тэхніка, павялічыўся лік рабочых. Дзесяцімесячны план усе прадпрыемствы выканалі на 105 процантаў. Камбінат № 2 і 29-ая фабрыка ўжо выканалі гадавы план.

— Яшчэ з большай упэўненасцю, — гаворыць дакладчык, — Совецкі Саюз уступае ў 24-ы год свайго існавання. Наш дзяржаўны карабель, кіруемы цвёрдай рукой Вялікага Сталіна, упэўнена ідзе ўперад. Радзіма наша адзелася ў сталь і браню. На варце мірнай працы народа стаіць гераічная Чырвоная Армія, гатовая ў любы момант знішчыць ворага на яго-ж тэрыторыі.

Урачыстае пасяджэнне віталі дэлегацыі ад піонераў, ад рабочых і інтэлігенцыі горада і ад часцей гарнізона.

З вялікім уздымам удзельнікі пасяджэння прынялі тэкст прывітальнай тэлеграмы вялікаму правадыру народаў Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

Святкаванне па раёнах нашай вобласці

30-ТЫСЯЧНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ У ГРОДНЕ

7-га лістапада горад прачнуўся рана. Усюды чутны былі бадзёрыя песні, гукі музыкі, аркестраў. Працоўныя спяшаліся на зборачныя пункты.

Дэманстрацыю працоўных адкрылі школьнікі. На плакатах і лозунгах яны выразілі сваю ўдзячнасць партыі і ўраду за сваё шчаслівае дзяцінства, за права на вучобу. Затым прайшла калона чыгуначнікаў Гродненскага вузла, аформленая на тэму: «Магутнасць транспарта совецкай дзяржавы».

Калона дэманстрантаў півзавода была аформлена на тэму: «Дружба народаў СССР». Удзельнікі гэтай калоны неслі макет Крэмля і плакаты, адлюстроўваючыя адзіную дружную сям'ю народаў нашай краіны.

Чоткім крокам у поўным баявым снаражэнні прайшла група асоавіяхімаўцаў і санітарнай дружыны.

Рабочыя шклозавода неслі 16 вялікіх шкляных шароў, кожны з якіх увасабляў адну з саюзных рэспублік. Пераможцы перадкастрычніцкага соцыялістычнага спаборніцтва, рабочыя фабрыкі скурзавода № 5, выканаўшыя гадавую праграму, красачна прадэманстравалі свае вытворчыя дасягненні.

Каля трыбуны прайшло больш 30 тысяч чалавек. Дэманстранты паказалі сваю радасць, дасягненні, і баявую гатоўнасць у любы час грудзьмі стаць на абарону радзімы.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ПРАЦОЎНЫХ ЛОМЖЫ

ЛОМЖА. (Ад нашага карэспандэнта). 6-га лістапада, напярэдадні кастрычніцкіх урачыстасцей, на ўсіх прадпрыемствах, ва ўстановах, у школах, сельсоветах і на выбарчых участках Ломжынскага раёна адбыліся ўрачыстыя сходы, прысвечаныя XXIII гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

У парткабінеце Ломжынскага райкома партыі, у кінотэатрах, дамах соцкультуры і хатах-чытальнях былі арганізаваны выстаўкі, якія адлюстроўвалі дасягненні совецкай улады за 23 годы.

7 лістапада, у дзень слаўнай гадавіны з самай раніцы ў горадзе—вялікае ажыўленне. Калоны працоўных накіраваліся да плошчы Міцкевіча, дзе адбылася дэманстрацыя.

Дэманстрацыю адкрыў зводны атрад Асоавіяхіма. З гордасцю неслі свае сцягі рабочыя завода сельскагаспадарчых машын, на 141 працэнт выканаўшыя кастрычніцкі вытворчы план. За імі прайшлі рабочыя цагельнага завода, члены швейна-трыкатажнай арцелі, рабочыя лесазавода, школьнікі, дэлегацыя Пятніцкага сельсовета і многія тысячы працоўных Ломжы і раёна.

Усяго ў дэманстрацыі ўдзельнічала каля 12 тысяч чалавек.

ТАВ. РАКОШЫ ПРЫБЫЎ У МАСКВУ

6 лістапада працоўныя Масквы сустракалі т. Мацяса Ракошы, які знаходзіўся ў зняволенні 15 год і вызвален у рэзультаце перагавораў паміж урадам СССР і венгерскім урадам.

К 10 гадзінам раніцы на Кіеўскі вакзал сабраліся прадстаўнікі заводаў, фабрык і інтэлігенцыі Масквы. Яны прыйшлі з чырвонымі сцягамі, плакатамі з прывітальнымі лозунгамі і плакатамі на рускай і венгерскай мовах. Сярод сустракаючых—тт. Д. З. Мануільскі, В. Пік, А. С. Шчэрбакоў, Тойво Антыкайнен, Г. М. Папоў, В. П. Пронін, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і партыйны актыў сталіцы.

У 10 гадзін 19 мінут да перона падыходзіць поезд. На пляцоўку вагона выходзіць тав. Ракошы. Поплеч з ім тав. Вейнбергер, вызвалены з венгерскай турмы пасля адбыцця 15-гадовага зняволення. Іх сустракаюць гарачымі, доўга незмаўкаючымі апладысментамі. Уздоўж перона хваляй перакатваюцца сяброўскія прывітанні:

— Няхай жыве тав. Ракошы!

— Дабро пажалаваць!

— Прывітанне стойкаму пролетарскаму барацьбіту!

Тав. Ракошы ўсхваляван цёплай сустрэчай. Ён па-сяброўску абдымае сустракаючых, горача паціскае ім рукі, сардэчна адказвае на бясконцыя прывітанні. Акружаны таварышамі, ён выходзіць на вакзальную плошчу і садзіцца ў аўтамабіль. Услед яму з соцень вуснаў несуцца словы прывітання і віншавання з прыбыццём у сталіцу Совецкага Саюза.

(ТАСС).

ЗА РУБЯЖОМ

Прамова Гітлера у Мюнхене

БЕРЛІН, 9 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе з Мюнхена, што 8 лістапада ў сувязі з гадавінай выступлення нацыянал-соцыялістаў у 1923 годзе ў Мюнхене Гітлер сказаў прамову, у якой даў агляд барацьбы нацыянал-соцыялістаў за ўладу.

Спыніўшыся на пытаннях англа-германскай вайны, Гітлер напомніў рад мірных прапаноў, якія ён рабіў ураду Англіі і якія былі адвергнуты. Гітлер падкрэсліў, што ў выніку адхілення Англіяй яго прапаноў стваралася абстаноўка, калі барацьба павінна весціся да рашучага канца.

Я адхіляў, заявіў Гітлер, усякія кампрамісы ў барацьбе за Германію, я адхіляю і цяпер любы кампраміс. З гэтымі людзьмі можа быць толькі адна барацьба — барацьба на знішчэнне.

Людскія страты, панесеныя Германіяй у цяперашняй вайне, заявіў Гітлер, складаюць нямногім больш паловы людскіх страт, панесеных немцамі ў франка-прускай вайне 1870—1871 гг. Гітлер пры гэтым асобна адзначыў, што велізарныя воінскія рэзервы Германіі не прыйшлося яшчэ ўвесці ў дзеянне, а матэрыяльныя запасы настолькі значныя, што трэба будзе спыніць работу некаторых прадпрыемстваў, бо няма дзе хаваць іх прадукцыю, і што ён прапанаваў развіваць тыя галіны прамысловасці, у якіх Германія павінна быць асабліва моцная. Германія як у адносінах людскога састава, так і ў адносінах матэрыяльных сродкаў, заявіў Гітлер, як ніколі, падрыхтавана да далейшай барацьбы. Гітлер таксама заявіў: Германія сумесна са сваім саюзнікам дастаткова моцная, каб процістаяць любой, магчымай у гэтым свеце камбінацыі. Не існуе ніводнай кааліцыі дзяржаў, роўнасільнай нашай.

СМЕРЦЬ НЕВІЛЯ ЧЭМБЕРЛЕНА

ЛОНДАН, 10 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ўчора ўвечары памёр Невіль Чэмберлен, былы прэм'ер-міністр Англіі.

КАМЮНІКЕ ГРЭЧАСКАГА КАМАНДАВАННЯ

АФІНЫ, 10 лістапада. (ТАСС). Грэчаскае тэлеграфнае агенцтва перадае наступнае камюнікэ грэчаскага вярхоўнага камандавання, апублікаванае ўвечары 9 лістапада: «Наступленне мясцовага характару, распачатае праціўнікам на правым флангу фронта і падтрыманае артылерыяй, было намі адбіта. Некалькі іншых сутычак таксама закончылася ў нашу карысць. Намі захоплена 80 палонных».

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

...сакратара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—пра...
...бухгалтэрыі—14-32